ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА
6 студзеня 2010 года

# Калядныя сустрэчы ў БДАТУ



**Добрай традыцыяй напярэдадні Каляд і Новага года ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце стала правядзенне выстаў творчых работ супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта *"Да Каляд — з любоўю"*.**

На выставу заўсёды прадстаўляюцца арыгінальныя работы: бісера-, саломапляценне, батык, кераміка, вышыўка, вязанне, карціны, напісаныя акварэллю, гуашшу, алеем. Кожная работа ўнікальная, а аўтар раскрываецца ў самым нечаканым ракурсе. Аказваецца, строгія выкладчыкі вышэйшай матэматыкі ці замежных моў у халодныя зімовыя вечары ствараюць дзіўную вышыўку, карціны з саломкі, цудоўна вяжуць. Студэнты таксама не саступаюць ім.

Сёлета ў дзень адкрыцця выставы адбылася сустрэча з акцёрамі тэатра і кіно Ірынай Нарбекавай і Яўгенам Піменавым. У сумныя, пахмурныя снежаньскія дні заўсёды сагрэюць сардэчнай цеплынёй стасункі з цікавымі, творчымі, духоўна багатымі людзьмі. Гучала паэзія, лірычныя песні пад гітару, аповеды пра творчасць і ўдзел акцёраў у духоўнай асвеце і дабрачыннай дзейнасці. Ірына Нарбекава і Яўген Піменаў аднадушныя ў меркаванні, што пра добрыя справы не трэба крычаць уголас, неабходна проста рабіць іх, дзяліцца дабром і талентам з гледачамі, слухачамі, бо галоўны наш суддзя — наша сумленне.

Студэнты і работнікі ўніверсітэта, якія прысутнічалі на выставе і сустрэчы з гасцямі ўстановы, атрымлі пазітыўны зарад на новы 2010 год.

**Алена КРУЖАЛАВА,**
**загадчык музея гісторы БДАТУ.**

НА ЗДЫМКУ: акцёры Ірына Нарбекава і Яўген Піменаў на сустрэчы ва ўніверсітэце.

**Фота аўтара.**